PolotskSU




9. Handbuch der bayerischen Geschichte. Band 2 / Hrsg. von Max Spindler / H. Lutz. – München: Beck, 1988. – XLII, 1398 s.
10. Kausch, Winfried. Geschichte der Theologischen Fakultät Ingolstadt im 15. Und 16. Jahrhundert (1472-1605) / Winfried Kausch. – Berlin: Duncker & Humblot, 1977. – 255 s.
11. Beati Petri Canisii Societatis Jesu, epistulae et acta. 2. 1556-1560. – Freiburg im Breisgau: Herder, 1898. – LXI, 950 s.
12. Polancus, Juan-Alphonso, de. Vita Ignatii Loiolae et rerum Societatis Jesu historia, Chronicon Societatis Jesu. 2. 1550-1552 / Juan-Alphonso de Polancus. – Matriti: Avrial, 1894. – 820 S.
13. Bianco, Franz Josef, von. J. Die alte Universität Köln und die späteren Gelehrten-Schulen dieser Stadt nach archivarischen und anderen zuverlässigen Quellen. I/1 / Franz Josef von Bianco. – Köln: Selbstverlag d. Verf., 1855. – XVI, 984, 405 S.
14. Brück, Anton Philipp. Die Anfänge der Jesuiten in Mainz / Anton Philipp Brück. Die Anfänge der Jesuiten in Mainz // Jahrbuch für das Bistum Mainz. – № 7. – 1955/57. – S. 196-207.
15. Reindl, Maria. Lehre und Forschung in Mathematik und Naturwissenschaften, insbesondere Astronomie an der Universität Würzburg von der Gründung bis zum Beginn des 20. Jahrhunderts. Dissertation. / Maria Reindl. – Würzburg: Universität, 1966. – VIII, 285 S.
16. Wegele, Franz Xaver von. Geschichte der Universität Würzburg. Teil 1: Geschichte / Franz Xaver von Wegele. -Würzburg: Stahel, 1882. – VIII, 509 S. (Neudruck Aalen 1969).
17. Wegele, Franz Xaver von. Geschichte der Universität Würzburg. Teil 2: Urkundenbuch / Franz Xaver von Wegele. -Würzburg: Stahel, 1882. – XV, 538 S. (Neudruck Aalen 1969).


## JESUITS AND GERMAN UNIVERSITIES

O. KELLER

*To date, it is known that many German universities in early New Time have taught Jesuits: in Bamberg, Wurzburg, Heidelberg, Dillingain, Ingolstadt, Cologne, Mainz, Molsheim, Osnabrueck, Paderborn, Trire, Freiburg, Erfurt.*
*In the article of Prof. Dr. Keller O.B. will talk about the role of the Jesuits in German universities: when the Jesuits first appeared in Germany; what positions were held in German educational structures; which Jesuit universities founded on German lands, etc.*
*The first Jesuit to appear on German lands is Pierre Emil Lazar Favre. It happened in 1540. But what role the representatives of the "Society of Jesus" played in the educational life of the country, it will be possible to find out by reading this material, based on the solid research of German scientists on this issue.*
***Key words:** Jesuits, first Jesuits on German lands, the role of Jesuits in German universities, from lectures to leadership of departments and faculties universities of the spiritual elite, universities of the secular elite, German Jesuit universities.*

УДК 1(476)(091)+141.30

## ПРАБЛЕМА НЕАБХОДНАСЦІ І КАНЦІНГЕНТНАСЦІ Ў ТВОРЧАСЦІ В. БУЧЫНСКАГА

**Клімовіч Г.І.**
Рэспубліка Беларусь, Мінск

*Артыкул прысвечаны даследаванню праблемы суаднясення канцінгентага і неабходнага відаў быцця ў творчай спадчыне прафесара Полацкай езуіцкай акадэміі – знакамітага філосафа і тэолага, аднаго з пачынальнікаў руху неасхаластыкі – Вінцэнція Бучынскага. Праблема неабходнасці і канцінгентнасці займае адно з галоўных месцаў у схаластычнай сістэме філасофіі, менавіта ад яе вырашэння залежыць магчымасць выкарыстання апастэріорных доказаў існавання Абсалюта. У рабоце аналізуецца класіфікацыя асноўных відаў быцця праз прызму філасофскіх поглядаў В. Бучынскага, прадстаўленых у рабоце Instutiones philosophicae (частка прысвечаная метафізіке), таксама даследавана палеміка па акрэсленаму пытанню з прадстаўнікамі французскай і нямецкай філасофіі гэтага часу. Разглядаецца выкарыстанне аўтарам канцэптаў absolute necessarium, hypothetice autem necessarium, metaphysice necessarium, physice necessarium, moraliter necessarium.*
***Ключавыя словы:** absolute necessarium, hypothetice autem necessarium, metaphysice necessarium, physice necessarium, moraliter necessarium, В. Бучынскі, Полацкая езуіцкая акадэмія, неасхаластыка, полацкая неасхаластыка, канцінгентнае і неабходнае.*

Вінцэнцій Бучынскі – адзін з найбольш слынных прадстаўнікоў Полацкай езуіцкай акадэміі, творчасць якога дагэтуль застаецца надаследаванай у поўнай ступені. Як вядома, ён быў студэнтам Полацкага езуіцкага калегіума, потым выкладаў у Полацкай езуіцкай акадэміі, далучыўся да стварэння і выдання часопіса «Miesięcznik Połocki». Пасля выгнання езуітаў з тэрыторыі Расійскай імперыі пэўны час жыў у Вене, дзе і выдаў сваю знакамітую працу Instutiones philosophicae [1], прысвечаную пытанням логікі, метафізікі і этыкі.

Пэўнае месца ў творчай спадчыне дадзенага аўтара займае праблема неабходнасці і канцінгетнасці. Калі з першым канцэптам усё дастаткова зразумела, то другі канцэпт патрабует пэўнага тлумачэння. Даволі часта канцінгентнасць перакладаецца як выпадковасць, але гэта не зусім так, хутчэй мы можам перакласці яго як не-неабходнае, асабліва ў адносінах да створаных істот, якія даследуюцца ў межах схаластычнага мыслення. На падставе канцінгетнага быцця фарміруюцца апастэріорныя доказы існавання Абсалюта. Гэта тое, што адначасова не з'яўляецца неабходным і не з’яўляецца немагчымым. Даследчык сярэднявечнай філасофіі – К. Бандуроўскі, напрыклад, адзначае, што карані дадзенага паняцця ў лацінскай мове суадносяцца са словам дотык, а ў значэнні здарацца таксама выкарыстоўваюцца, але не выкарыстоўваюцца ў значэнні – выпадковы. Таксама немагчыма дадзены канцэпт атаесамляць толькі з паняццем магчымае [2, с. 64–65]. з пункту гледжання філасофіі канцінгенцыя мае падставай адрозненні паміж быццём і існасцю. Усе істоты абмежаваны ў сваім існаванні і з'яўляюцца канечнымі, існасць (essentia) такой фінальнай істоты не можа атаясамляцца з яе

PolotskSU



існаваннем (existentia). Гэта т.зв. існаванне ад іншага, якое характэрна для ўсіх створаных рэчаў. Паняцце канцінгетнасці цесна звязана таксама з канцэптам магчымасці (potentia). Канцінгетнасць з'яўляецца ўнутранай характарыстыкай рэчы.

Упершыню праблема канцінгетнасці і неабходнасці афармляецца ў творчасці Арыстоцеля. У старажытнагрэцкай філасофіі сфармаваліся два асноўныя падыходы да дадзенай праблематыкі: канцэпцыя Діадора, якая тлумачыць магчымасць існавання з вынікаў (немагчымае, неабходнае і магчымае) і канцэпцыя стоікаў, дзе існаванне звязана з наяўнасцю знешніх перашкод.

Наступны этап развіцця пазначанай праблематыкі звязаны з перыядам Сярэднявечча. Яна знайшла адлюстраванне ў поглядах Фамы Аквінскага, дзе ён паміж іншым адзначае прамую залежнасць канцінгентнага створанага быцця ад неабходнага, а таксама рэфлексуе над праблемай магчымасці пазнання Абсалютам канцінгентнага быцця, закранаецца канцінгентнасць і ў пытаннях суаднясення канцэптаў прадвызначанасці і свабоды волі чалавека. Фама Аквінскі выкарыстоўвае пазіцыю Арыстоцеля, вылучаючы два тыпы канцінгентнага: канцінгентнае, якое з'яўляецца вынікам свабоднай волі, у адносінах да таго, што маецца ў нашым распараджэнні, канцінгентнае, як вынік таго, што матэрыя знаходзіцца ў патэнцыі к двум супрацьлегласцям ў прыродных рэчах.

Дадзены канцэпт сустракаецца ў філасофіі Дунса Скота, дзе ён на падставе канцінгентнага быцця прыходзіць да высновы аб існаванні быцця неабходнага, адначасова падкрэсліваючы, што адзінай крыніцай канцінгентнага выступае ens per se – быццё неабходнае. Першае з’яўляецца фінальным, другое – бясконцым. Аналіз доказу Дунса Скота аб існаванні Абсалюту на падставе суаднясення канцінгетнага і неабходнага прадстаўлены ў рабоце Эт. Жыльсона – аднаго з славутых неатамістаў XX ст., дзе ён фармуліруе яго наступным чынам: доказ існавання нейкага першабыцця праводзіцца ў два этапы: спачатку даказваецца, што для мыслення неабходна нейкая здагадка адносна першабыцця, затым, што дадзенае першабыццё існуе рэальна [3, с. 77–78]. Як адзначае Жыльсон, у дадзеным ходзе доказу нельга пачынаць ад паняцця Бога, што змусіла аўтара звярнуцца да канцінгетнага тыпу быцця і зрабіць яго фундаментам рэфлексіі на карысць існавання неабходнага першабыцця. У выніку, калі ў цэнтры ўвагі Фамы Аквінскага знаходзіцца рэальнае існаванне Бога, то Дунс Скот даследуе мадальнасці быцця: фінальнае – бяконцае, неабходнае-канцінгентнае і г.д.

У перыяд схаластыкі ранняга мадэрну праблема суаднесення неабходнага і канцінгетнага працягвае існаваць, у прыватнасці, яна стала аб’ектам філасофскіх пошуках Фр. Суарэса, які адзначае, што немагчыма сцвярджаць, што нешта існуе і адначасова не існуе [4, с. 423], закранае ён у тым ліку і праблему апрыёрных і апастэрыёрных доказаў. На наш погляд, найважнейшы ўнёсак Суарэса ў развіццё дадзенай тэмы заключаецца ў класіфікацыі прычын на неабходныя і вольныя. Падставай першых з’яўляецца прыродная неабходнасць, а другіх – свабода волі, уласцівая людзям. Воля Абсалюту стварыць свет адносіцца да катэгорыі свабодных прычын і займае першаснае палажэнне ў дадзеным шэрагу. Яшчэ адна важная заслуга Фр. Суарэса – перадоленне «анталагічнага ўніверсалізму» Фамы Аквінскага, станаўленне пазіцыі «анталагічнага сінгулярызму» праз абгрунтаванне тэзісу а гнасеалагічнай першаснасці індывідуальнага і яго першаснага пазнання розумам чалавека [5, с. 12].

Рэфлексія над праблемай неабходнасці прысутнічае і ў творчасці Хр. Вольфа, дзе ён адзначае: «Калі тое, што супрацьпастаўляецца рэчы, утрымлівае ў сябе нешта супярэчлівае, гэта робіць дадзеную рэч неабходнай» [6, с. 243]. Таксама ён указвае на асноўную рысу неабходнага – яго нязменнасць: «Тое, што неабходна, тое нязменна. Таму што, калі бы яно магло змяняцца, яно магло б і не быць, а гэта пярэчыць яго неабходнасці» [6, с. 244].

Наступны перыяд асэнсавання ідэі неабходнасці і канцінгентнасці ў заходнееўрапейскай філасофіі звязаны з творчасцю Лейбніца, адкуль яна і патрапляе ў неасхаластыку. На станаўленне філасофскіх поглядаў Лейбніца, у сваю чаргу, безумоўна паўплываў узгаданы вышэй Суарэс. Дзякуючы Лейбніцу праблема асэнсавання канцінгентнага і неабходнага стала разглядацца праз прапанаваны ім закон дастатковай падставы (principium rationis sufficientis).

Непасрэдна ў творчасці В. Бучынскага праблема суаднясення неабходнасці і канцінгентнасці закранаецца ў межах метафізікі, у другой частцы работы Instutiones philosophicae [1], прысвечанай дадзенай праблематыцы, на с. 52–57, § 55–59. У § 55 В. Бучынскі дае вызначэнне паняцця неабходнага, а таксама прадстаўляе класіфікацыю розных відаў неабходнасці. Згодна поглядам аўтара, пад неабходнасцю трэба разумець такі від быцця, які існуе, пры гэтым немагчыма як яго неіснаванне цалкам, так і яго існаванне іншым чынам [1, с. 52]. Таксама В. Бучынскі вылучае наступныя віды неабходнасці: абсалютна неабходнае, гіпатэтычнае, але неабходнае, метафізічна неабходнае, фізічна неабходнае, маральна неабходнае (absolute necessarium, hypothetice autem necessarium, metaphysice necessarium, physice necessarium, moraliter necessarium) [1, с. 52]. Гіпатэтычна і абсалютна неабходнае мае падставай карэляцыю з унутранай існасцю рэчы і яе ўплывам на навакольны свет, метафізічна, фізічна і маральна неабходнае вылучаюцца ў межах прадмета філасофскага даследавання.

Згодна В. Бучынскаму, абсалютна неабходнае мае дадзеную неабходнасць як унутраную ўласцівасць існасці і не патрабуе знешніх умоў для існавання. Яно разглядаецца ў якасці бясконцага, нязменнага і неабмежаванага [1, с. 53] і гэтым яно адрозніваецца, напрыклад, ад разумення Абсалюта ў Суарэса, па якому ў якасці галоўных характарыстык Абсалюта разглядаюцца праўдзівасць, дабро і адзінства. Быццё – гэта ўнутраная якасць абсалютна неабходнага, іншымі словамі, выкарыстоўваючы рыторыку Фамы Аквінскага – менавіта ў ім існасць і існаванне супадаюць, ўсе віды быцця (маецца не ўвазе, як гіпататэчна неабходнае, так і канцінгентнае) залежаць ад яго. Трэба адзначыць, што падзел быцця на гіпатэтычнае і неабходнае не з’яўляецца аўтарскай знаходкай В. Бучынскага. Дадзеная класіфікацыя была досыць распаўсюджанай і сустракалася ў якасці класічнай ва ўсіх творах аўтараў, якія працавалі ў рэчышчы схаластыкі на працягу XVI – першай паловы XIX ст. На пазначаныя паняцці звяртае ўвагу Дэкарт ў сваіх «Медытацыях», прысутнічаюць дадзеныя канцэпты і ў творах Хр. Вольфа [7, с. 177].

Гіпатэтычная неабходнасць звязана з некаторымі выпадковымі ўмовамі, якія могуць існаваць, а могуць не існаваць, у ім знаходзіцца прапарцыйная сувязь паміж нашымі пачуццямі і прадметам. У адрозненні ад абсалютна неабходнага быцця гіпатэтычна неабходнае быццё мае характарыстыкі часу і прасторы [1, с. 53]. Гіпатэтытчнае і неабходнае віды быцця не асэнсоўваюцца як супрацьлеглыя ў творчасці В. Бучынскага, але маюць апазіцыйныя характарыстыкі ў адносінах да падзеі – абсалютная неабходнасць заўсёды займае папярэдняе становішча і з’яўляецца прычынай, гіпатэтычная неабходнасць займае падначаленае становішча і павінна разумецца як вынік уздзеяння абсалютна неабходнага.

Рэфлексія на тэму канцінгентнага быцця мае падставай прынцып дастатковасці існавання Лейбніца. Паняцце і асноўныя ўласцівасці дадзенага віду быцця разглядаюцца В. Бучынскім ў § 57. Аўтар адзначае, што канцінгентнасць быцця звязана з існасцю створанага быцця, валодае магчымасцю, а не неабходнасцю існавання. Адначасова, як ужо падкрэслівалася раней, канцінгетнае нельга разглядаць толькі ў якасці выпадковага. В Бучынскі адзначае, што канцінгентнае з’яўляецца вынікам уздзеяння неабходнасці. Дадзены від быцця можа як існаваць, так і не існаваць, але крыніцай існавання заўсёды мае быццё

PolotskSU



неабходнае, пры гэтым, калі першае мае ўнутрана неабходную прычыну для свайго існавання, то для канцінгентнага быцця гэта прычына будзе знешняй. Таксама неабходна адзначыць, што канцінгентнае звычайна разглядаецца як індывідуальнае існаванне.

Пасля вызначэння асноўных відаў быцця і іх уласцівасцяў В. Бучынскі пераходзіць да найбольш складанай часткі рэфлексіі – пошуку аргументаў, якія дазволяць абыйсці відавочна слабыя месцы аргументацыі на карысць існавання віду абсалютнай неабходнасці, якой з'яўляецца Бог. Дадзеныя праблемы з'яўляюцца аргументамі, якія звычайна выкарыстоўвалі прадстаўнікі філасофіі Асветніцтва ў барацьбе супраць схаластычнай філасофіі, сфармуляваны яны аўтарам наступным чынам: 1) канцінгентнае быццё не мае ў сваім змесце неабходнай паўнаты быцця, а значыць, сувязь паміж быццём канцінгентным і неабходным пабудаваць немагчыма, таму што гэта два розныя віды быцця; 2) калі ўявіць бясконцую серыю канцінгентнага, кожная дастатковая падстава існавання вынікае з папярэдняй, але ў такой сувязі дасягнуць паняцця неабходнага немагчыма, бо адзінкавае індывідуальнае канцінгентнага вядзе нас да такога ж віду быцця; 3) з папярэдняга аргументу вынікае наступны: ідэі, адпаведнай падставе індывідуальнага, знайсці немагчыма, бо калі звяртацца ў пошуку быцця першаснага да бясконцай серыі канцінгетнага дасягнуць яго не прадстаўляецца магчымым [1, с. 55–57].

Разбураючы першае і другое пярэчанне, В. Бучынскі звяртаецца да канцэпту розуму, які, згодна з поглядамі неасхаластыкаў, мае магчымасць пазнаваць не толькі пачуццёвыя, але і рацыянальныя паняцці. Адначасова аўтар адзначае, што чалавечы розум не мае здольнасці ўявіць бясконцую серыю індывідуальнага быцця, а калі ён не можа гэтага зрабіць, значыць, рана ці позна прыйдзе к факту наяўнасці быцця неабходнага. Аўтар не адмаўляецца ад прынцыпу крэацыі ex nihilo, але адзначае, што з нічога немагчыма стварыць проста нічога, таму, калі нешта здольнае існаваць, гэта азначае, што ў яго ёсць падстава, дадзеная падстава простая і мае дастатковую прычыну для існавання ў сваёй сутнасці, з'яўляецца крыніцай існавання, з гэтага безумоўна, вынікае існаванне неабходнага быцця, якім і ёсць Абсалют. Галоўны агрумент Бучынскага заключаецца ў тым, што прадстаўнікі атэістычнай ідэалогіі памыляюцца, разглядаючы прамежкавы элемент канцінгентнага быцця ў якасці першаснага.

Такім чынам, погляды В. Бучынскага трэба разумець як важны ўнёсак у развіццё праблемы даследавання суадносін канцінгентнага і неабходнага відаў быцця. Аўтар застаецца верным сфармуляванай яшчэ да яго ў межах схаластычнай традыцыі класіфікацыі відаў быцця, адначасова ён вымушаны карыстацца дасягненнямі philosophia recentiorum і выступаць абаронцай схаластычнай сістэмы, завочна палемізуючы з прадстаўнікамі французскай філасофіі XVIII ст., а таксама з І. Кантам, сістэма якога мела вялікае ўздзеянне на філасофскія погляды інтэлектуальнай эліты таго часу.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Buczyński, W. Instutiones philosophicae, pars secunda / W. Buczyński. – Viennae. – 1844. – 302 p.
2. Бандуровский, К.В. Понятие «контингентного» и проблема свободы воли у Фомы Аквинского / К.В. Бандуровский // Историко-философский ежегодник'99. – 2001. – С. 64–72.
3. Жильсон, Э. Дух средневековой философии / Э. Жильсон. – М. : Институт философии, теологии и истории св. Фомы. – 2011. – 560 с.
4. Суарес, Ф. Метафизические размышления. / Ф. Суарес. – М. : Институт философии, теологии и истории св. Фомы. – 2007. – 776 с.
5. Солонин, Ю.Н. Философия Суареса в историко-философской перспективе / Ю.Н. Солонин // Verbum. – Вып. 1. – 1999. – С.10-13
6. Христиан Вольф и философия в России. — СПб.: РХГИ, 2001. — 400 с.
7. Ciafardone, R. Necessitas absoluta e necessitas hypotetica nella concezione wolffiana del mondo / R. Ciafardone // Macht und Bescheidenheit der Vernunft. Beiträge zur Philosophie Christian Wolffs. – fHildesheim-Zürich-New York. – 2005. – P. 171–183.

## THE PROBLEM OF NECESSITY AND CONTINGENCY IN THE WORKS OF W. BUCZYNSKI

H. KLIMOVICH

*The article is devoted to the problem of correlation of contingent and necessary types of being in the creative heritage of the professor of the Polotsk Jesuit Academy – the famous philosopher and theologian, one of the founders of the neo-scholastic movement – Wincenty Buchinsky. The problem of necessity and contingency has an important place in the scholastic system of philosophy; the possibility of using a posteriori proofs of the existence of the Absolute depends on its solution. The paper analyzes the classification of the main types of being through the prism of philosophical views of W. Buchinsky, presented in the work Instutiones philosophicae (part devoted to metaphysics) also explores the controversy on this issue with representatives of French and German philosophy at this time. The use of the author of the concepts absolute necessarium, hypothetice autem necessarium, metaphysice necessarium, physice necessarium, moraliter necessarium is considered.*

***Ключавыя словы:*** *absolute necessarium, hypothetice autem necessarium, metaphysice necessarium, physice necessarium, moraliter necessarium, В. Бучынскі, Полацкая езуіцкая акадэмія, неасхаластыка, полацкая неасхаластыка, канцінгентнае і неабходнае.*

УДК 94(476.5):328.1(476.5)(091)«1697–1704»

## ПОЛАЦКІЯ СОЙМІКІ ў 1697–1704 гг.

**Мацук А.У.**
Рэспубліка Беларусь, Мінск

*В конце XVII – начале XVIII вв. полоцкая шляхта выступила на стороне «республиканцев» в их борьбе с Сапегами. В полоцких сеймиках в это время участвовало большинство представителей местной элиты. Более того, полоцкие послы были активными в выступлениях «республиканцев» в это время, чем их позиция не отличалась от позиции иных поветов востока Княжества. Как удалось установить во главе полоцкой элиты сторонников «республиканцев» находились роды Немировичей Щитов, Зеновичей, Пжисецких, Рыпиньских, Пакашей и Щитов Забельских. Именно поэтому полоцкие сеймики принимали решения необходимые «республиканцам». Полоцкая шляхта осталась верной Августу II и в его*

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
# ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
# І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Наваполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў”. Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2**

© Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:**
**ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ**
**І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп’ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

---

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 $^{1}/_{8}$. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

---

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.